# Сістэмныя выклікі для беларускага грамадства і ўрада ў перыяд палітычных зменаў у Беларусі

## Эсэ выпускніка курсу “Публічная палітыка для пачаткоўцаў”

Калі мы пачынаем думаць ці казаць пра сыстэмнасьць, то мусім думаць у дзьвух накірунках: выклікі ў дзяржаўнай вэртыкальнай сыстэме кіраваньня краінай і выклікі, якія не зьмяняюцца з цягам часу, прысутнічаюць пэўны гістарычны пэрыяд, не зьнікаюць і існуюць надалей, ствараючы пагрозы. Пачнем з разбору другога кірунку, а да першага вернемся напрыканцы.

Сёньня Беларусь і беларускае грамадзтва трапіла ў надзвычай складаную сытуацыю: у Беларусі разгорнутыя найбуйнейшыя рэпрэсіі адносна актывістаў, палітычных дзеячоў і ўсіх грамадзянаў і грамадзянак, якія прагнуць годнага нацыянальнага жыцьця. Пад ціскам знаходзіцца ўсё беларускае – за беларускую мову на вуліцы могуць затрымаць і “прысудзіць” арышт, беларускія друкарні і кнігарні зачыняюць, іх уладальнікі і супрацоўнікі падпадаюць пад перасьлед і апынаюцца ці ў турмах, ці ў эміграцыі. Гэтыя ўмовы створаны цяперашнім палітычным рэжымам Лукашэнкі, які прыйшоў да ўлады праз гібрыдныя выбары 1994-га году, тэрарыстычны акт у будынку парлямэнта ў 1996-м, праз які па сутнасці быў зроблены канстытуцыйны пераварот у дзяржаве. Гэты рэжым зьяўляецца прарасейскім і па сваіх функцыях выконвае хутчэй ролю акупацыйнай расейскай адміністрацыі, чым нацыянальнага беларускага ўрада.

Калі казаць пра геапалітычны кантэкст, то пасьля поўнамаштабнага расейскага ўварваньня ва Ўкраіну Беларусь і беларускія праблемы/выклікі пачалі губляць сваё месца на міжнароднай і эўрапэйскай павестцы дня. Акрамя таго, зьмяніліся ўмовы ў самой Беларусі: рэпрэсіі пашырыліся, пад перасьлед пачалі падпадаць антываенныя актывісты, заклікі і дзеяньні, а таксама праз візавую крызу ўскладніліся натуральныя людзкія сувязі паміж Беларусьсю і Эўропай.

Калі паглядзець на вышэйапісаныя фактары, можам зразумець тое, што маем сёньня і апошнія гады. Гэты кантэкст быў падобны і за ўвесь пэрыяд з моманту аднаўленьня Незалежнасьці 25 жніўня 1991-га.

За апошнія 32 гады Незалежнасьці Беларусь пакутавала спачатку ад гібрыднай камуністычнай улады (1990-1994), а пасьля - ад усталяванага з дапамогай Расеі рэжыма Лукашэнкі (уратаваньне ад імпычмэнту, перамовы з посткамуністычным, раней намэнклятурным урадам, фінансавы і алігархічны ўплыў).

У пэрыяд з 1990-га году Расея пачала прымаць ці ўжо прымала ўдзел у шматлікіх канфліктах: вайна ў Сакартвэла (1991-1993), вайна ў Малдове (1992), канфлікт у Таджыкістане (1992-1997), дзьве вайны ў Ічкерыі, уварваньне ў Сакартвэла (2008), вайна Расеі супраць Украіны (2014 - сёньня) і іншых.

Тут ужо можам пабачыць пэўную сыстэму выклікаў і крыніцы праблем. Калі мы паспрабуем паглядзець на больш шырокую гістарычную пэрспэктыву, то гэта сыстэма будзе даволі цьвёрда стаяць на падмурку.

У якасьці гістарычных фактаў і довадаў можам прывесьці наступныя: камуністычная (савецкая) акупацыя Беларусі (1918-1939, 1944-1991), рэпрэсіі з элемэнтамі генацыду 1933 - 1937 года, павальная русіфікацыя, якая амаль без перапынкаў ажыцьцяўляецца расейскімі і прарасейскімі сіламі апошнія 250 гадоў, тры нацыянальна-вызвольныя паўстаньні супраць Расейскай Імпэрыі ў 18-19 ст., а таксама шматлікія войны ВКЛ з Масковіяй, асаблівай увагі з якіх варты Крывавы патоп (1654-1667), падчас якога Літва згубіла да ⅓ насельніцтва.

Такім чынам, гледзячы на кантэкст, можам сфармуляваць сыстэму вылікаў і акрэсьліць яе ў вызначэньні "Рускі мір". Гэтая імпэрская сыстэма зьнішчэньня, каланізацыі і асыміляцыі пагражае амаль усім суседзям Расеі. Яна прынесла вялікія страты Беларусі і ейнаму народу ў мінуўшчыне і працягвае глыбока нэгатыўна ўплываць і сёньня.

З улікам кантэкста - і гістарычнага, і сёньняшняга - робіцца відавочным, што гэты сыстэмны выклік будзе значнай перашкодай і праблемай для новага беларускага ўраду ў пэрыяд палітычных зьменаў. Калі на момант новага вакна магчымасьцяў Расея яшчэ будзе існаваць як дзяржава, якія ажыцьцяўляе імпэрскую захопніцкую палітыку, асбаліва праз вайну ва Ўкраіне, відавочна, што яна будзе працягваць сваю дзейнасьць і ў Беларусі. Варта заўважыць, што нават пры любых палітычных зьменах у самой Расеі гэтая палітыка будзе працягвацца. Такую выснову можна зрабіць праз аналіз выказваньняў, сьветапогляду і візыі будучыні сёньняшняй "дэмакратычнай" расейскай апазыцыі – яны таксама мараць пра вялікую імпэрыю, "імпэрыю зла".

Тут вернемся да першага кірунку з пачатку. У сёньняшняй беларускай вэртыкалі "рускі мір" займае не апошняе месца. Асабліва гэта тычыцца топ-чыноўнікаў і вайсковых структур (КДБ, МУС і іншыя). Факты выкарыстаньня расейскай сымболкі, "паняткаў" і плякатаў у гэтак званых "пакаяльных відэа" ад рэжымных струтур, а таксама іхнія публічныя заявы і выказваньні сьведчаць пра іхнюю палітычную і культурную арыентацыю. Гэта таксама будзе ствараць выклікі для новай улады.

Таксама лічу важным заўважыць, на колькі сёньня разгарнуўся працэс русіфікацыі Беларусі, пра які ўзгадваў раней. Спрабуючы ацаніць ягоны ўплыў і рэзультаты, варта заўважыць, што, відавочна, большасьць беларусаў сёньня – расейскамоўныя. Гэта ў сваю чаргу прывяло да спажываньня вялікае колькасьці расейскамоўнага=расейскага (прарасейскага) кантэнта і інфармацыі ў інтэрнэце і сацыяльных сетках. Што ў сваю чаргу фармуе ў беларусаў расейскі сьветапогляд і сьветаўспрыманьне, задае вэктар бачаньня/візыі і мысьленьня. Наступствы гэтай зьявы сёньня закранаюць не толькі і не столькі сталае пакаленьне, але таксама маюць значны і шырокі ўплыў на беларускую моладзь. Вядомы выраз "Моладзь – наша будучыня". Якую будучыню мы атрымаем з беларускай расейскай моладзьдзю?

Такім чынам, маем дзьве розныя сытуацыі, сыстэмы выклікаў: умоўна "унутраных" ці сучасных (наяўных), зьвязаных з сытуацыяй унутры Беларусі і агульным кантэкстам

расейскага гібрыднага і прамога ўплыву (уварваньня ва Ўкраіну, акупацыі Беларусі, стварэньня гібрыдных і наўпроставых пагроз краінам-суседзям, краінам Балтыі і Эўрапэйскага Зьвязу).

Калі пакінуць гэтыя сыстэмныя выклік і не зьвяртаць на іх ўвагі, не шукаць і не будуваць ужо сёньня пляны і спосабы іхняга вырашэньня, то новая ўлада/ўрад і беларускае грамадзтва агульна атрымаюць гэтую сыстэмную праблему ў спадчыну. А яна ў сваю чаргу працягне нэгатыўны і гібрыдны ўплыў на будучую беларускую палітыку, геапалітычнае становішча, эканамічнае і сацыяльнае жыцьцё, нацыянальнае адраджэньне і разьвіцьцё.

Асьветніцкая справа сёньня, пашырэньне ўсяго беларускага, распрацоўка плянаў адраджэньня мовы і культуры з працягненьнем расейскамоўнай часткі беларускага грамадзтва – гэта ўсё мае вырашальную і ключавую ролю ў дасягненьні прабеларускай/беларусацэнтрычнай пасьпяховай сьветлай будучыні.

Аўтар: Ільля Маліноўскі